**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

аб унясенні змяненняў у Пастанову
аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб'ектаў

11 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы зварот ад выбрачага суб'екта "Аб'яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць",

## ВЫЗНАЧЫЛА:

9 траўня 2024 года ў Выбарчую камісію паступіў ліст ад ініцыятара спісу кандыдатаў выбарчага суб'екта "Аб'яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць" Георгія Дзмітрука наступнага зместу (тэкст прыводзіцца ў адпаведнасці з арфаграфіяй аўтара):

"Паважанная спадарства
Просім Вас удакладніць інфармацію, якая апублікуецца вамі на Вашых афіцыйных крыніцах

Поўная назва:
Аб'яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" "Салідарнасць"

Наш лозунг словы Паўла Севярынца:
ВЕРЫМ! МОЖАМ! ПЕРАМОЖАМ!
Спіс кандыдатаў:

1. Яўген Вільскі (Yauheni Vilski)
2. Георгі Дзмітрук (Heorhi Dzmitruk)
3. Яўген Дудкін (Yauheni Dudkin)
4. Аліна Смірнова (Alina Smirnova)
5. Алена Янушкоўская (Alena Yanushkouskaya)
6. Андрэй Зуеў (Andrei Zuyey)
7. Сяргей Верамеенка (Siarhei Verameyenka)
8. Марына Кіявец (Maryna Kiyavets)
9. Зміцер Лупач (Dzmitry Lupach)
10. Ігар Валяеў (Valiayeu Ihar)
11. Віталь Марокка (Vitali Marokka)

12. Алена Шабуня (Alena Shabunia)
13. Таццяна Хмялеўская (Khmialeuskaya Tatsiana)
14. Віталь Мезенцаў (Vitali Mezentseu)
15. Анатоль Сементовіч (Anatoli Sementovich)
16. Таццяна Малашчанка (Tatsiana Malashchanka )
17. Вікторыя Хатэнка (Khatenko Viktoryia)
18. Святлана Вішнеўская (Sviatlana Vishneuskaya)
19. Жанна Сементовіч (Sementovich Zhanna)

Просім трымацца нашых афіцыйных назваў”

Прааналізаваўшы тэкст ліста Георгія Дзмітрука, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што аўтар меў на ўвазе наступныя просьбы:

1) унесці змены ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года, змяніўшы назву выбарчага суб’екта і пазначыўшы яе наступным чынам - Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць”;

2) унесці змены ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года, дадаўшы кірылічнае напісанне імёнаў і прозвішчаў кандыдатаў спіса выбарчага суб’екта побач з імёнамі і прозвішчамі, якія згодна з пададзенымі ў Выбарчую камісію звесткам маюць выключна лацінскае напісанне (паводле пашпарта);

3) Выбарчай камісіі прыняць да ведама, што ў выбарчага суб’екта ёсць уласны лозунг (словы Паўла Севярынца).

Разгледзеўшы на пасяджэнні ўзнятыя заяўнікам пытанні, Выбарчая камісія прыходзіць да наступных высноваў.

1. Выбарчая камісія пагаджаецца з прапановай Георгія Дзмітрука “трымацца нашых афіцыйных назваў”, з прычыны чаго не бачыць магчымасці для здавальнення просьбы аб унясенні зменаў у назву выбарчага суб’екта.

Згодна з падпунктам 6.4. пункта 6 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне), па выніках разгляду дакументаў Камісія на працягу 3 дзён з моманту падачы дакументаў ці моманту дапаўнення дакументаў прымае рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб’екта і спісу кандыдатаў для ўдзелу ў выбарах або аб адмове ў рэгістрацыі. Рэгістрацыя суб’екта ажыццяўляецца на падставе дадзеных, пералічаных у падпункце 6.1 пункта 6 Палажэння, якія былі дасланы Георгіем Дзмітруком як ініцыятарам выбарчага суб’екта, праз адпаведную гугл-форму 17 красавіка 2024 года ў 21:11:04 (CET). Згодна з гэтымі дадзенымі назва выбарчага суб’екта - “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”.

Рашэннем аб рэгістрацыі выбарчага суб’екта і спіса кандыдатаў для ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду ад 22 красавіка 2024 года № 24/04/22-1 зацверджана назва выбарчага суб’екта і ягоны склад у адпаведнасці з дасланымі Георгіем Дзмітруком звесткамі.

Згодна з падпунктам 6.6. пункта 6 Камісія выносіць канчатковае рашэнне па спрэчках аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў не пазней як за 30 дзён да дня

пачатку галасавання. Адпаведная Пастанова аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў была прынятая Выбарчай камісіяй 25 красавіка 2024 года.

Выбарчая камісія адзначае, што да моманту накіравання ліста ад 9 траўня 2024 года Георгі Дзмітрук у афіцынай камунікацыі з Выбарчай камісіяй не ставіў пытанне аб няправільнасці выкладання назвы выбарчага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”, у прыватнасці:

- на адрас Выбарчай камісіі не былі пададзены ўдакладненні ў перыяд пасля запаўнення заяўкі ад выбарчага суб’екта і да моманту прыняцця рашэння аб рэгістрацыі ад 22 красавіка 2024 года № 24/04/22-1;
- не было абскарджана рашэнне аб рэгістрацыі ад 22 красавіка 2024 года № 24/04/22-1;
- адсутнічала адпаведная рэакцыя на апублікаваныя на сайце КР звесткі аб назве спіса выбарчага суб’екта (што ўтрымлівалася ў пратаколах пасяджэнняў Выбарчай камісіі, а таксама ў Пастанове аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года).

Больш за тое, ужо пасля зацвярджэння канчатковага спісу выбарчых суб’ектаў заяўнік у лісце ад 27.04.2024 сам выкарыстоўваў у афіцыйнай камунікацыі назву, напісанне якой цяпер аспрэчвае: “***Аб'яднанне беларускіх партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць"*** *выступае з заявай аб падтрымцы намаганьняў Выбарчай Камісіі правесьці выбары празрыста і дэмакратычна…”*).

Такім чынам, для здавальнення просьбы ініцыятара спісу выбарчага суб’екта Камісія не бачыць уважных прычын.

2. Выбарчым суб’ектам дасланы імёны і прозвішчы кандыдатаў са спісу ў кірылічным і лацінскім напісанні, ў адпаведнасці з зацверджанай Пастановай ад 25 красавіка 2024 года паслядоўнасцю. Пры аналізе транслітарацыі Выбарчай камісіяй не выяўлена адхіленняў ад кірылічнага адлюстравання імёнаў і прозвішчаў.

Нягледзячы на тое, што спіс кандыдатаў выбарчага суб’екта Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” у цяперашнім выглядзе (пашпартная транслітарацыя) быў зацверджаны рашэннем ад 22 красавіка 2024 года і Пастановай ад 25 красавіка 2024 года, Выбарчая камісія не бачыць перашкодаў для дадатковага пазначэння імёнаў і прозвішчаў кандыдатаў згодна з беларускім правапісам. Больш за тое, на думку Камісіі такое адлюстраванне спісу кандыдатаў у большай меры спрыяе мэтам выбарчага працэсу, паколькі з’яўляецца больш зручным і чытэльным для пераважнай колькасці выбаршчыкаў, так як транслітарацыя імёнаў і прозвішчаў паводле беларускага пашпарту не стасуецца з беларускім правапісам (кірылічным нарматыўным, кірылічным “тарашкевіцай”, biełaruskaj łacinkaj).

Гэтая акалічнасць, па меркаванні Выбарчай камісіі, можа ставіць выбарчы суб’ект ў няроўнае становішча з іншымі, што супярэчыць міжнародным стандартам дэмакратычных выбараў, з прычыны чаго лічыць неабходным задаволіць просьбу.

3. Што тычыцца лозунга, пра які ў сваім лісце палічыў неабходным паведаміць Георгі Дзмітрук – Выбарчая камісія з павагай ставіцца да любой творчасці, запазычанняў і іншых адметных спосабаў прыцягнення ўвагі да кандыдатаў, з прычыны чаго не мае пярэчанняў наконт выкарыстання лозунгаў падчас агітацыйнай кампаніі. У адпаведнасці з падпунктам 8.2 пункта 8 выбарчыя суб'екты і кандыдаты вольныя ў выбары сродкаў і метадаў вядзення выбарчай кампаніі з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў правоў чалавека і стандартаў дэмакратычных выбараў.

Разам з тым, размяшчэнне лозунгаў, слоганаў, улётак, рэкламнай прадукцыі не ўваходзіць у кампетэнцыю Выбарчай камісіі, бо супярэчыць яе функцыям і ролі ў выбарчым працэсе. Непасрэдна лозунгі не падлягаюць ні рэгістрацыі, ні зацвярджэнню і не патрабуюцца ад спісаў выбарчых суб'ектаў згодна з Палажэннем. У выпадку парушэння правоў выбарчага суб'екта, у тым ліку няправільнасці выкладзенай на інфармацыйных рэсурсах звестак пра апошняга, ён управе паведаміць Выбарчай камісіі паводле афіцыйнага канала сувязі аб канкрэтным парушэнні. Камісія, у сваю чаргу, прымае неадкладныя меры рэагавання пры выяўленні такога парушэння.

На падставе вышэй выкладзенага, кіруючыся пп. 4.9.4 п. 4, пп. 8.2 п. 8 Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб'ектаў ад 25 красавіка 2024 года ўнесці змяненні, выклаўшы звесткі пра выбарчы суб'ект "Аб'яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць" наступным чынам:

**"Аб'яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць"**

| | |
|---|---|
| 1 | Яўген Вільскі (Yauheni Vilski) |
| 2 | Георгі Дзмітрук (Heorhi Dzmitruk) |
| 3 | Яўген Дудкін (Yauheni Dudkin) |
| 4 | Аліна Смірнова (Alina Smirnova) |
| 5 | Алена Янушкоўская (Alena Yanushkouskaya) |
| 6 | Андрэй Зуеў (Andrei Zuyey) |
| 7 | Сяргей Верамеенка (Siarhei Verameyenka) |
| 8 | Марына Кіявец (Maryna Kiyavets) |
| 9 | Дзмітры Лупач (Dzmitry Lupach) |
| 10 | Алена Шабуня (Alena Shabunia) |
| 11 | Ігар Валяеў (Valiayeu Ihar) |

| | |
|---|---|
| 12 | Віталь Марокка (Vitali Marokka) |
| 13 | Таццяна Хмялеўская (Khmialeuskaya Tatsiana) |
| 14 | Віталь Мезенцаў (Vitali Mezentseu) |
| 15 | Таццяна Малашчанка (Tatsiana Malashchanka) |
| 16 | Анатоль Сементовіч (Anatoli Sementovich) |
| 17 | Вікторыя Хатэнка (Khatenko Viktoryia) |
| 18 | Святлана Вішнеўская (Sviatlana Vishneuskaya) |
| 19 | Жанна Сементовіч (Sementovich Zhanna) |

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька